**Наталія Баркар** *(Атава, Канада)*: **Дзесяць свядомых крокаў часопіса "КУЛЬТУРА. НАЦЫЯ"** *(да дзесяцігоддзя з дня заснаваньня - 2012-2022)*



Пра аўтара: Наталія Баркар: Адукацыю атрымала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Кандыдат біялагічных навук па спецыяльнасці «Імуналогія». У Канадзе працуе ў якасці эксперта ў галіне «*in vitro дыягностыка*". Сябра рэдакцыйнай калегіі часопіса "Культура. Нацыя". Прымае актыўны удзел у грамадскім жыцьці беларусаў Атавы. Цікавіцца кухнямі народаў свету.

About the author: Natalia Barkar received her education at the Belarusian State University. Candidate of biological sciences (PhD), majoring in "Immunology". In Canada, she works as an expert in the field of "*in vitro diagnostics*". Member of the editorial board of the web-magazine "Culture. Nation". Takes an active part in the public life of Belarusians in Ottawa. She is interested in the cuisines of the peoples of the world.

Анатацыя. Падаецца гісторыя і этапы станаўленьня часопіса, напрамкі яго дзейнасці, аналізуецца чытацкая аўдыторыя, прыводзіцца публікацыйная актыўнасць па гадах і асноўныя дасягненьні часопіса.

## Заснаваньне і этапы станаўленьня

Часопіс "Культура. Нацыя" быў заснаваны д-рам Пётрам Мурзёнкам у снежні 2012 года. Часопіс быў зарэгістраваны ў Канадзе ("ISSN Canada"), як он-лайн незалежнае перыядычнае выданьне з прысваеньнем яму міжнароднага нумара ISSN 2291-4757. Су-заснавальнікамі часопіса былі Наталія Баркар і Вікторыя Казлова.

Асноўнай мэтай часопіса з'яўляецца асьвета – праз абмеркаваньне праблем беларускай культуры, развіцьця беларускасьці і беларускай нацыі. На самым пачатку існаваньня часопіса было пазначана, што ён прымае для публікацыі толькі арыгінальныя аналітычныя артыкулы, эсэ, а таксама абгрунтаваныя дыскусіі і каментары па гісторыі, мове, літаратуры, сацыялогіі, традыцыях і іншых пытаньнях, маючых дачыненьне да развіцьця беларускай нацыі. Як паказала практыка, за 10 год больш 95% змешчаных у часопісе матэрыялаў з'яўляюцца арыгінальнымі. Трэба адзначыць, што электроннае выданьне часопіса размешчана на веб-сайце www.sakavik.net, на якім дадаткова зьмяшчаюцца найбольш цікавыя на наш погляд

матэрыялы аб сучасным і будучым Беларусі, запазычаныя з другіх крыніц (падаецца назва крыніцы альбо лінк на яе). Матэрыялы з другіх крыніц падаюцца па меры паступленьня.

Першы нумар часопіса *online выйшаў* 14 сакавіка 2013 года. Першыя шэсць нумароў часопіса выйшлі пад назвай "САКАВІК". Далей, часопіс пачаў выходзіць з новай назвай - "КУЛЬТУРА. НАЦЫЯ" (са зменай серыйнага нумара на ISSN 2562-9506), бо на думку рэдакцыйнай калегіі такая назва прадстаўляла значна большыя рамкі для яго дзейнасці. Да вясны 2018 года, часопіс "КУЛЬТУРА. НАЦЫЯ" выходзіў чатыры разы на год (да 21-нумара уключна). Пачынаючы з 2018 года, з прычын тэхнічных пытаньняў пры падрыхтоўцы нумароў часопіса, рэдакцыя вырашыла публікаваць часопіс два разы ў год (вясна\восень). З кастрычніка 2020 года часопіс набыў статус перыядычнага выданьня Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Канадзе (БІНІМ, Канада).

Асноўнымі рубрыкамі часопіса ёсць арыгінальныя артыкулы і эсэ па гісторыі, культуры, мове, літаратуры, краязнаўству і фальклору, нататкі пра вядомых беларускіх юбіляраў, звесткі аб дзейнасьці беларускіх суполак і іншыя.

**HISTORY of webzine "KULTURA. NATSYJA" / "CULTURE. NATION"**

- Webzine was founded by Piotra Murzionak in December 2012. Co -founders: Natalia Barkar, Victoria Kazlova
- The magazine first appeared *online* on March 14, 2013. Its first 6 issues were published under the name "SAKAVIK" (ISSN 2291-4757). Then magazine was re-named to "KULTURA. NATSYJA" (ISSN 2562-950)
- Purpose: to provide another platform to discuss Belarusian history and culture, and to support the development of Belaruskasć (*Belarusian heritage*)
- Belarusian is the preferred language of the magazine; however, materials in other languages are also published.
- Along with this magazine's articles the most interesting materials from other sources related to Belarusian culture are also presented on its web-site www.sakavik.net.
- By decision of the editorial board the webzine is now being published twice a year (since 21th issue).
- In October 2020, the journal acquired the status of a publication of the Belarusian Institute of Art and Sciences in Canada (BINIM, Canada).

У склад рэдакцыі ўваходзяць: Пётра Мурзёнак, галоўны рэдактар і заснавальнік, і сябры рэдакцыі – Наталія Баркар, Юрась Грыбоўскі, Вольга Іпатава, Аляксандр Каралькевіч, Сяргей Панізьнік, Ігар Пракаповіч, Юрась Рапецкі, Галіна Туміловіч. Сябры рэдакцыі з'яўляюцца як аўтарамі часопіса, так і актыўнымі яго прапагандыстамі ў інфармацыйнай прасторы. У дадатак, сп. А. Каралькевіч аказвае

тэхнічныя кансультацыі ў падтрымцы вэб-сайта, дзе змяшчаецца часопіс, а таксам ў адміністрацыі вэб-сайта Беларускага інстытута навукі і мастацтва (Канада), а Ю.Рапецкі прымае непасрэдны ўдзел у перакладзе тэкстаў і абстрактаў на англійскую мову. Сёлета, у канцы лістапада 2022 года, выйдзе 30-нумар часопіса «Культура. Нацыя», дзе будуць апублікаваны, разам з іншымі артыкуламі, і матэрыялы нашай канферэнцыі «Беларуская нацыя вачыма дыяспары і суайчыньнікаў».

*Да ведама*:

- часопіс «Сакавік» выдаваўся ў 1947 годзе беларускімі пасляваеннымі эмігрантамі ў Остэргофене (Германія) ў 1947 годзе (Л.Савёнак, А.Адамовіч);

- часопіс «Культура», які выдаваўся з 1947 па 2000 гг., быў заснаваны Е.Гедройцам у Мезон-Лаффіт (Францыя), які адыграў значную ролю ў пасляваенным фарманьні польскай нацыі.

## Аўтары

## Спіс аўтараў / Authors list (75)

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| А | Д | К | Р | Х |
| Reynall Andreychuk | Дар'я Данілевіч | David Kilgour | Юрась Рапецкі | Ірына Хадарэнка |
| Алена Анісім | Ніна Дэбольская | Алесь Кіркевіч | Якуб Рапецкі | Уладзімір Хахлун |
| Chandra Arya | Ж, З | Аксана Колб | Алег Рудакоў | Ш |
| Анатоль Астапенка | Melanie Joli | Paterson Franco Costa | Вацлаў Рудовскі | Юрась Шамецька |
| Ліза Афанасьева | Віталь Зайка | Марына Кражава | С | Валянціна Шаўчэнка |
| Б | Аляксандр Згерскі | Мікалай Крукоўскі | Алесь Сімакоў | Вадзім Шышко |
| Наталія Баркар | Е | Л | Павел Севярынец | Антон Шэхаўцоў |
| Вячаслаў Бортнік | Вольга Ермалаева -Франко | Вікторыя Лейпі | Ларыса Скрыпко | Ю |
| Алег Буевіч | І | Аляксандра Логвін | Вячка Станкевіч | Лявон Юрэвіч |
| Яўгенія Бурштын | Вольга Іпатава | Арх. С. Логін | Тадэуш Стружэцкі | Я |
| В | К | Алена Лявончанка | Івонка Сурвілла | Аліса Януш |
| Ірына Варабей | Валеры Кавалеўскі | М | Паўліна Сурвілла | |
| Jim Watson | Сяргей Кандраценка | Алена Макоўская | Ганна Сурмач | |
| Віталь Воранаў | Святлана Кабанава | Генадзь Мельнічук | Т | |
| Kathleen Wayne | Алесь Карлюкевіч | Пётра Мурзёнак | Алег Трусаў | |
| Г | Леанід Карповіч | Каця Музычэнка | Галіна Туміловіч | |
| Наталля Гардзіенка | Michael Qaqish | П | Ф | |
| Барыс Генгало | Язэп Квач | Сяргей Панізьнік | Аляксей Федарэнка | |
| Зіна Гімпелевіч | Міхась Кенька | Інга Папавайтэ | | |
| Юрась Грыбоўскі | Таццяна Кенько | Ігар Пракаповіч | | |
| Валеры Грыцук | Andris Kesteris | | | 5 |

У 29 нумарах часопіса «Культура. Нацыя», якія выйшлі да сённяшняга дня, свае свае матэрыялы прадставілі 75 аўтараў. З іх, што вельмі прыемна, 26 аўтараў з Беларусі, 30 – з Канады (уключаючы афіцыйных асоб), 7 - са Злучаных Штатаў Амерыкі, 2 – з Бразіліі, 2 – з Польшчы, па аднаму – з Аўстраліі, Германіі, і іншых краін. У спіс найбольш актыўных аўтараў, хто апублікаваў 4 і больш артыкулаў, трапілі – Сяргей Панізьнік (37), Ігар Пракаповіч (18), Таццяна Кенько (13), Ірына Хадарэнка (10), Аляксандр Згерскі (9), Язэп Квач (7), Міхась Кенька (9), Леанід Карповіч (6), Галіна Туміловіч (6), Юрась Грыбоўскі (4), і натуральна рэдактар часопіса П. Мурзёнак (83).

**Актыўнасць часопіса**

Агулам у 29 нумарах часопіса размешчана 368 матэрыялаў і 803 здымкі. Як бачым на гэтым графіку, аб’ём нумароў і колькасць змешчаных у іх артыкулаў павялічвалася з кожным годам.




У дадатак, на старонках вэб-сайта www.sakavik.net, дзе публікуецца часопіс “Культура. Нацыя”, змешчаны 1752 запісы (посты) па тэмах, якія маюць непасрэднае дачыненьне да мэты і задач часопіса. Гэтыя посты ідуць пад наступнымі катэгорыямі: аб’явы, сьвета, адукацыя, бібліятэка часопіса, гісторыя, знешнія адносіны, культура, літаратура, мова, нацыя, беларусы, праект “Разам”, рэлігія, слова рэдактара, тэатр. Асобнай, спецыяльнай катэгорыяй ідзе тэма “Этнацыд беларусаў”.

**Аўдыторыя**

За час існаваньня вэб-сайта яго наведалі амаль 29,000 чытачоў са 120 краін свету (48,958 праглядаў або 1.7 праглядаў на чытата). Магчыма гэта і няшмат у параўнанні з больш прадвінутымі сайтамі, але кожны робіць што можа – “кожная кропля далучаецца ў ручайкі, якія зліваюцца ў агульную вольную раку”. Часопіс вельмі ганарыцца тым, што большасць праглядаў (27,815 праглядаў або 56.8% ад агульнай колькасці) прыпадае на чытачоў з Беларусі. Далей ідуць – Канада (16.9%), ЗША (7.4%), Расія (5.5%), Польшча (2.9%), Украіна (2.2%), Германія (1.6%), Літва (1.0%), ЕС (0.9%), Кітай (0.9%).

# Чытачы / Audience

**Table. Number and proportion of views by countries**
***(total - 48,958 views, 29 issues in 2013-2022)***

**За час існаваньня вэб-сайта яго наведалі амаль 29,000 чытачоў са 120 краін свету**

**During the existence of the website, it has been visited by almost 29,000 readers from 120 countries of the world.**

| Country | Views | % |
|---|---|---|
| Belarus | 27,818 | 56.8 |
| Canada | 8,285 | 16.9 |
| USA | 3,637 | 7.4 |
| Russia | 2,692 | 5.5 |
| Poland | 1,440 | 2.9 |
| Ukraine | 1,100 | 2.2 |
| Germany | 775 | 1.6 |
| Brasilia | 568 | 1.2 |
| Lithuania | 485 | 1.0 |
| EU | 441 | 0.9 |
| China | 437 | 0.9 |
| Other | 1,332 | 2.7 |

6

## Тэматыка і праекты

Тэматыка арыгінальных матэрыялаў ў сваёй большасці адпавядае асноўнай мэце часопіса – асвятленьню праблем, звязаных з будаўніцтвам беларускай нацыі, у прыватнасці яны прысвечаны тэарэтычным асновам пабудовы беларускай дзяржавы; стратэгіі развіцця беларускай нацыі; менталітэту беларусаў; узаемасувязі нацыі і свабоды, а таксама нацыі і царквы; існаванню ўсходнеславянскай (беларуска-ўкраінскай) цывілізацыі, і іншым пытаньням. У прыватнасці, часопіс правёў некалькі статыстычных даследаванняў адносна ацэнкі колькасці беларусаў у дыяспары і міграцыйных працэсаў беларусаў у Канаду.

У рамках часопіса былі выкананы шэраг праектаў, уключаючы дыскусіі па пытаннях нацыянальнага будаўніцтва. Так, 23 лістапада 2014 г. адбылася скайп-дыскусія на тэму «Нацыянальнае будаўніцтва ў постсавецкіх краінах: агульнае і адрознае» з удзельнікамі з Украіны, Грузіі, Беларусі і Канады (часопіс “Культура. Нацыя”, №8, снежань 2014 і №9, сакавік 2015).

У верасьні 2016 года, падчас 32-й сустрэчы беларусаў Паўночнай Амерыкі часопісам была ініцыявана дыскусія “Роль нацыяльнай культуры і асьветы ў развіцьці грамадзянскай супольнасьці беларусаў у замежжы” (КН, №15, верасень 2016).

У 2015-2018 гг., на старонках дзевяці нумароў часопіса “Культура. Нацыя” (нумары часопіса №12-№18), было ініцыявана стварэньне і далейшае абмеркаваньне «Стратэгіі развіцця беларускай нацыі». У першапачатковай распрацоўцы праекта

ўдзельнічалі Алена Анісім, Аляксандр Кашо, Пётра Мурзёнак, Алег Трусаў, Ірына Шумская. Праект апублікаваны 6 лютага 2016 г. для далейшага грамадскага абмеркавання. Рэдакцыя выказала шчырую падзяку А. Астроўскаму, М. Кеньку, Б. Станішэўскаму, В. Шышко, В. Якавенку, а таксама сябрам Асіповічскага Таварыства беларускай мовы (ТБМ) за крытычныя заўвагі, дапаўненні, змены ў стылі і мове дакументаў. Праект «Стратэгія разьвіцьця беларускай нацыі» быў апублікаваны ў газэце «Наша ніва» (7 лютага на старонках «НН» было 55 камэнтароў газэты), газеце «Новая эра/Новы час», на сайтах ЗБС "Бацькаўшчына", Таварыства беларускай мовы, "Мы – нацыя", "Наш край", "Пагоня/Пагоня" (Чэхія), Навіны Беларусі. Праект абмяркоўвалі Польскае радыё - Беларуская рэдакцыя (27.02.2016) і «Белсат» (12.03.2016). "Стратэгія развіцьця беларускай нацыі" зьмешчана на асобнай старонцы вэб-сайта www.sakavik.net для больш шырокага азнаямленьня, а таксама перададзена ў Офіс сп. С. Ціханоўскай, разам з "Тэзісамі да тактыкі і стратэгіі нацыянальнага будаўніцтва ў сучасных умовах"(КН, №28, лістапад 2021).

На старонках часопіса публікаваліся даклады па беларускай тэматыцы зробленыя на канферэнцыях, уключаючы даклады сяброў БІНІМ, Канада:

- на 32-м Зьезде беларусаў Паўночнай Амэрыкі, уключаючы даклады зробленыя падчас дыскусіі *"Роль нацыяльнай культуры і асьветы ў развіцьці грамадзянскай супольнасьці беларусаў у замежжы"* (гатэль "Лорд Элгін", Атава, 3-5 верасьня 2016) (КН, №15, верасень 2016; 9 дакладаў);

- на the Congress of the Canadian Federation for Humanities and Social Sciences (Таронта, май 2017) ("КН", №18, чэрвень 2017; 6 дакладаў).

- на ўрачыстым паседжанні, прысвечаным сьвяткаваньню 100-годдзя абвяшчэньня незалежнасці БНР, арганізаваным БІНІМ, Канада і ЗБК (Атава, 11 сакавіка 2018 года, Цэнтральны будынак Канадыйскага Парламента - Commons Reading Room, Parliament Hill) (КН, №21, сакавік 2018; 13 дакладаў і выступленняў);

- на канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэньня Уладзіміра Караткевіча і арганізаванай БІНІМ, Канада і ЗБК (КН, №20, сьнежань 2020; 6 дакладаў);

- на Xth Congress of International Council for Central and East European Studies (Montreal, August 4, 2021) (КН, №28, лістапад 2021; 3 даклады – Г.Туміловіч, Ю.Шамецька, П.Мурзёнак на панэлі пад назвай "From Legends to Modern Belarus". Паседжаньне было цалкам БІНІМ-аўскім, арганізатар – д-р П. Мурзёнак, мадэратар – д-р Н. Баркар).

Сярод іншых праектаў, змешчаных на спецыяльнай старонцы вэб-сайта, часопісам створана Бібліятэка слайдаў “БЕЛАРУСЬ НАЗАЎСЁДЫ”, якая змяшчае прэзентацыі ў Power Point “Беларусы ў Вялікім Княстве Літоўскім”, “ПОЛАЦКАЕ Княства”, “Беларуская дзяржаўнасць”, “Абвяшчэнне незалежнасці Беларусі”, “Беларуская дзяржаўнасць”, “Замкі Беларусі”, а таксама звыш 60 кароткіх інфармацыйна-адукацыйных матэрыялаў у рамках праекта “Разам/ РАЗАМ” (інфармацыйная улётка ўяўляе сабой кароткую даведачную інфармацыю па канкрэтнай тэме, якая змяшчаецца на адной старонцы).

Падчас шматгадовай навуковай працы ў часопісе па пытаннях нацыянальнага будаўніцтва, галоўным рэдактарам часопіса выдадзены 3 кнігі, дзве з іх у Беларусі:

- “Шляхі да беларускай нацыі”, Мінск, 2016, 344 с.,
- “Чым павінен ганарыцца кожны беларус”, Мінск, 2017, 96 с., і адна ў ЗША
- BELARUS: PROSPECTS OF A MIDDLE POWER, Lexington books: Lanham-Boulder-New York-London. 2022, 346 pp.

***Асноўныя вынікі***

1. У часопісе “КН” апублікаваны матэрыялы 75 аўтараў, з іх 26 аўтараў непасрэдна з Беларусі.
2. Агулам у 29 нумарах часопіса размешчана 368 матэрыялаў і 803 здымкі.
3. У дадатак, на старонках вэб-сайта www.sakavik.net, дзе публікуецца часопіс “Культура. Нацыя”, змешчаны 1752 запазычаныя з другіх крыніц запісы-посты па тэмах, якія маюць непасрэднае дачыненьне да мэты і задач часопіса. Гэтыя посты як і непасрэдна матэрыялы часопіса ідуць пад рознымі катэгорыямі: аб’явы, сьвета, адукацыя, бібліятэка часопіса, гісторыя, знешнія адносіны, культура, літаратура, мова, нацыя, беларусы, праект “Разам”, рэлігія, слова рэдактара, тэатр. Асобнай, спецыяльнай катэгорыяй ідзе тэма “Этнацыд беларусаў”.
4. За час існаваньня вэб-сайта яго наведалі амаль 29,000 чытачоў са 120 краін свету (48,958 праглядаў або 1.7 праглядаў на чытата). Часопіс вельмі ганарыцца тым, што большасць праглядаў (27,815 праглядаў або 56.8% ад агульнай колькасці) прыпадае на чытачоў з Беларусі. Часопісу яшчэ шмат трэба зрабіць для сваёй папулярызацыі і павялечэньню пазнаваемасці і чытаемасці.
5. Разам з публікацыяй арыгінальных артыкулаў і дакладаў на канферэнцыях, прысвtчаных будаўніцтву беларускай нацыі, часопіс арганізаваў і правёў такія дыскусіі, як «Нацыянальнае будаўніцтва ў постсавецкіх краінах: агульнае і адрознае», “Роль нацыяльнай культуры і асьветы ў развіцьці грамадзянскай супольнасьці беларусаў у замежжы”, “Нацыянальнае будаўніцтва і сучаснасьць. 2015 - 2017”.
6. Вынікам дыскусіі “Нацыянальнае будаўніцтва і сучаснасьць. 2015 - 2017” стала стварэньне «Стратэгіі разьвіцьця беларускай нацыі», размешчанай на старонцы вэб-сайта для шырокага азнаямленьня.

7. Супрацоўнікі часопіса прымалі непасрэдны ўдзел у складаньні праграм і правядзеньні шэрагу мерапрыемстваў: 32-гі Зьезд беларусаў Паўночнай Амэрыкі, Атава, 3-5 верасьня 2016; святкаваньне 100-годдзя абвяшчэньня незалежнасці БНР, Атава, 11 сакавіка 2018 года, Цэнтральны будынак Канадыйскага Парламента; канферэнцыі, прысвечанай 90-годдзю з дня нараджэньня Уладзіміра Караткевіча (лістапад 2020); Xth Congress of International Council for Central and East European Studies (Montreal, August 4, 2021).

8. Сярод іншых праектаў, змешчаных на спецыяльнай старонцы вэб-сайта, часопісам створана Бібліятэка слайдаў і інфармацыйных улётак "БЕЛАРУСЬ НАЗАЎСЁДЫ".

9. Падчас шматгадовай навуковай працы ў часопісе па пытаннях нацыянальнага будаўніцтва, галоўным рэдактарам часопіса выдадзены 3 кнігі, дзве ў Беларусі ("Шляхі да беларускай нацыі", Мінск, 2016, 344 с.), "Чым павінен ганарыцца кожны беларус", Мінск, 2017, 96 с., і адна ў ЗША "Belarus: Prospects of a Middle Power", Lexington books: Lanham-Boulder-New York-London. 2022, 346 pp.

**Natalia Barkar** (*Ottawa, Canada*): **"Ten Conscious Steps for "Kultura. Natsyja" magazine** *(in honour of its Decade-long Existence Since its Inauguration: 2012 – 2022)*"
***(webzine "Kultura. Natsyja", issue 30, November 2022, 167-174, www.sakavik.net)***
*Abstract*. The history and stages of formation of the magazine "Culture. Nation", the areas of its activity, the readership is analyzed; publication activity by year and the main achievements of the magazine are given.

**Наталия Баркар** (Оттава, Канада): **«Десять осознанных журнла «Культура. Нацыя" (в честь 10-летия с момента основания: 2012 - 2022)"** ***(интернет-журнал «Культура. Нацыя», выпуск 30, ноябрь 2022 г., стр. 167-174, www.sakavik.net)***

*Резюме*. Представлены история и этапы становления журнала «Культура. Нация», направления его деятельности, читательская аудитория; дана публикационная активность по годам и основные достижения журнала.